
18+
Уладзімір
Казлоў
Гопнікі
Логвінаў

Ласкава запрашаем у неласкавыя ўскраіны Магілёва сярэдзіны 80-х! Нармальныя пацаны і нефармалы, свой раён і чужы, хаза і хабза, дыскач і апорка, Гарбачоў і Рэйган, будзённае жыццё і раптоўная смерць... Тут набор піражных "Несталічны" ад першага пакалення беларускіх гопнікаў. Уладзімір Казлоў, унікаючы любасці/нянавісці, хутчэй адстаронена, выяўляе сваё юнацтва, пакідае будучаму пакаленню амаль што антрапалагічны атракцыён у форме раманеты.

9 786094 920585

18+

Гэтую кнігу не варта чытаць людзям, чулым да ненарматыўных выразаў і апісання брутальных сцэн.

## УЛАДЗІМІР КАЗЛОЎ

Нарадзіўся ў 1972 годзе ў Магілёве — тады тыповым савецкім прамысловым горадзе сярэдняга памеру. Дзяцінства і юнацтва прайшлі на яго праблемнай ускраіне. Ён назіраў, як Савецкі Саюз паступова змяняўся дзякуючы перабудове Гарбачова, а затым знянацку ды ўвогуле спыніў сваё існаванне.

Тры гады вучыўся ў магілёўскім тэхнічным ВНУ, а ў 1992 годзе паступіў у Мінскі лінгвістычны ўніверсітэт. Пераезд у сталіцу рэспублікі амаль супаў з крышам СССР і паўставаннем незалежнай Беларусі. Першыя гады вучобы праходзілі на фоне «дзікага» капіталізму і пошуку беларусамі новай, постсавецкай тоеснасці.

Пасля ўніверсітэта працаваў журналістам, а затым галоўным рэдактарам англамоўнай газеты Minsk News / Belarus Today. Скончыў магістратуру ў ЗША па спецыяльнасці «журналістыка».

З 1998 года пачаў пісаць апавяданні. Улетку 2000 года з’ехаў у Маскву. У адносна свабоднай Маскве працаваў журналістам, перакладчыкам, рэдактарам. У 2002 годзе ў выдавецтве Ad Marginem выйшла яго першая кніга — «Гопнікі». За ёй паследавалі два дзясяткі кніг прозы і нон-фікшна. На пачатку 2010-х пачаў здымаць незалежныя мікрабюджэтныя фільмы па ўласных сцэнарах як рэжысёр, удзельнічаў у расійскіх і міжнародных фестывалях, атрымліваў узнагароды.

У 2022 годзе, пасля пачатку расійскага ўварвання ва Украіну, з’ехаў з Расіі і цяпер жыве ў нямецкім Штутгарце.

Уладзімір Казлоў

# ГОПНІКІ

Пераклад з рускай

Логвінаў

Ласкава запрашаем у неласкавыя ўскраіны Магілёва сярэдзіны 80-х! Нармальныя пацаны і нефармалы, свой раён і чужы, хаза і хабза, дыскач і апорка, Гарбачоў і Рэйган, будзённае жыццё і раптоўная смерць... Тут набор піражных «Несталічны» ад першага пакалення беларускіх гопнікаў. Уладзімір Казлоў, унікаючы любасці/нянавісці, хутчэй адстаронена, выяўляе сваё юнацтва, пакідае будучаму пакаленню амаль што антрапалагічны атракцыён у форме раманеты.

Гэтую кнігу не варта чытаць людзям, чулым да ненарматыўных выразаў і апісання брутальных сцэн.

ISBN 978-609-492-058-5

© Уладзімір Казлоў, 2025
© Lohvinau Publishing House, 2025

# ПРАДМОВА
# ДА БЕЛАРУСКАГА ВЫДАННЯ

Гэтая кніга ўпершыню выходзіць на беларускай мове больш як праз 20 гадоў пасля таго, як яна была напісаная.

"Гопнікі" былі створаныя і ўпершыню апублікаваныя ў зусім іншай палітычнай і культурнай рэальнасці. Тады Расія была яшчэ не краінай-агрэсарам, якая распаўсюджвае свае імперскія амбіцыі на постсавецкую прастору, а нефармальным цэнтрам рускамоўнай культуры. Калі "Гопнікі" выйшлі, іх чыталі ў розных былых рэспубліках СССР — у Расіі, Беларусі, Украіне, Казахстане. Кніга свабодна прадавалася ў кнігарнях гэтых краін. І ніхто асабліва не факусаваўся на тым, што яе напісаў беларускі аўтар, а выдала расейскае выдавецтва.

На жаль, шмат змянілася за гэтыя гады. Напаўшы на Украіну і падтрымаўшы рэпрэсіі

аўтарытарнага рэжыму ў Беларусі, Расія адштурхнула ад сябе людзей у гэтых краінах, зрабіўшы ўсё, звязанае з рускай мовай і рускай культурай, таксічным ва ўспрыманні многіх.

Доўгі час я шчыра не бачыў сэнсу ў перакладзе маіх кніг на беларускую: навошта, калі практычна любы беларус лёгка можа чытаць па-руску? Але паступова я зразумеў, што за апошнія гады сфармаваўся новы, малады беларускі чытач, які часта прынцыпова не чытае кніг на рускай мове, нават напісаных беларускімі рускамоўнымі аўтарамі.

Пасля пратэстаў і рэпрэсій 2020 года я сам у большай ступені адчуў сваю “беларускасць”. І, застаючыся рускамоўным аўтарам, я шаную гэтую магчымасць публікацыі “Гопнікаў” на беларускай ды спадзяюся, што дзякуючы гэтаму кніга дойдзе да новых чытачоў і будзе ўспрымацца найперш як беларуская кніга беларускага аўтара, якой яна і ёсць.

10 лютага 2025, Штутгарт

# КАНІКУЛЫ

Ура! Канікулы! Тры месяцы! Учора быў апошні дзень вучобы, але гэта нават і не вучоба была. Проста прыходзілі два лысыя дзядзькі і тоўстая цётка адбіраць вучняў у школу для дурняў на наступны год. Пыталіся табліцу множання, шэсць на восем шэсцьдзясят чатыры (ці не?), чым адрозніваецца бык ад трактара, і што цяжэйшае — кіло хлеба або кіло цукру. Але каго абралі, не сказалі, скажуць потым. А пакуль што можна гуляць у футбол і ў грошы, і дакурваць канчары і шпурляць камяні ў цягнікі, каб разбіць шыбу, і вылоўліваць і вешаць чорных катоў і шмат-шмат чаго яшчэ.

*

Заўтра ўстану позна-позна і выйду на балкон і зірну ўверх на сіняе-сіняе неба і плюну ўніз на лысіну суседа знізу, які робіць зарадку на сваім

балконе, і ён загарлае: гэта што, блядзь, дождж, ці што?

А я пабягу ў туалет сцаць, пахáваю на кухні — і на вуліцу, каб паспець залезці па яблыкі ў сад да Афэлка, пакуль ён не вярнуўся з базару. Яблыкі яшчэ зялёныя і паскудныя, аднак ірваць іх у Афэлкавым садзе — кайф, а самы кайф — гэта бачыць яго пысу потым, калі ён зразумеў, што яблыкаў няма: усё абарвалі.

А потым — на кар'ер купацца, хоць вада там і руда-бура-малінавая з хімкамбіната і клейзавода, на якім робяць з костак угнаенні, і там ёсць яшчэ пацукі па паўметра ростам, і іх можна біць палкамі, але зараз неяк нехуць. Якія яшчэ пацукі? Не да пацукоў тут.

Шкада, што баб на кар'еры амаль няма, а тыя, хто ёсць, купацца не ходзяць — сцыкухі. Разаслалі коўдры і ляжаць дагары дупамі. І колькі ты да іх не падыходзь — тыпу, дзяўчаты, хадзем купнемся, — зробяць калгасныя рожы: мы не купаемся, і нам тут добра, тыпу такія дзевачкі-прыпевачкі і цэлкі. Не вучыце дзядзю мурашам фігі паказваць. Я пра вас усё ўжо ведаю, хто з кім і калі і куды.

А пасля кар'ера пайду дахаты жэрці, пакуль яшчэ нікога няма, а то пачнуць мне маралі чытаць, маўляў, трэба дома па вечарах сядзець, а не бадзяцца абы-дзе, і што гэта ў цябе за кумпанія, і такія дружбаны ні да чаго добрага цябе ні

прывядуць, і сядзеў бы ты лепш дома і кніжкі чытаў — вунь колькі ў спісе літаратуры на лета, а ты?

Я? Што я? Я нічога, лепш бы вы мне менш мазгі ябалі, а то я наагул тады дадому шамаць не пайду, скраду што-небудзь у гастраноме. Наагул усе казлы і шакалы, ну, пра іх і казаць няма чаго.

А ўвечар — праз плот і на дыскач, дзе ўсе свае і ніхто не будзе дакалупвацца, што, тыпу, хулі вы прыцёгліся, малыя?

Нас свае пацаны яшчэ ў тым годзе абяцалі пусціць на групавуху да Наташкі, але потым самі не пайшлі, раздумалі, а можа, нас не захацелі браць — тыпу, малыя яшчэ, зарана.

Дзе мы малыя? Мы задзіралі ярухам спадніцы пасля дыскача сто разоў і мацалі іх, але ярухі могуць ісці не адныя, а з пацанамі, і тады трэба з'ёбваць, а то іх пацаны, асабліва калі ўпітыя, дык так адпрацуюць, што потым тыдзень будзе не да дыскатэк, нават драчыць і тое не захочацца. А ўсё з-за баб, сук паганых.

Дыскач скончыцца, але дахаты піздзюхаць рана — яшчэ толькі поўнач. Значыцца, можна яшчэ палазіць па парку, пашукаць, дзе цалуюцца і ябуцца, і выпудзіць і камянямі закідаць, але бронь божа нарвацца на пацаноў, якія адны і без ярух, і таму сядзяць сумныя і бухаюць.

А перад сном забяжым яшчэ раз у сад да Афэлка — сказаць дабранач. Ён сад вартуе, ходзіць па ім са стрэльбай, і мы крыкнем яму: дабранач,

Сяргей Сцяпанавіч, не засні, а то сад табе спалім, а ён закрычыць: ідзіце адсюль, шкарадзь, тут вам не смехуёчкі.

І ўсё, цяпер — дадому, спаць. А заўтра — усё тое ж самае.

# ДРУЖБАН

Я мушу станоўча ўплываць на гэтага прыдурка. Класуха здурнела са сваім камунізмам. Для яе найгалоўнейшае — “моц калектыву”. Нават іншыя настаўнікі з яе смяюцца, а завуч нам сказала па сакрэце, што яе трымаюць у школе апошні год. Прыйшоў новы час, у краіне перабудова, і такія, як яна, вэк на пенсію.

Можна, вядома, перасесці, але класуха помслівая, будзе потым падкусваць і паводзіны знізіць, ды і Быра прымецца лезці: чаго гэта ты не захацеў са мной сядзець, кантрольную даць спісаць, чаму жміндзішся?

Дагэтуль у мяне з Бырам усё было нармуль: ён ніколі не прыкалупваўся. Мы нават амаль не размаўлялі за тыя паўгода, што ён у нас у класе. Ён ціхі такі дваячнік, хаця насамрэч хуліган яшчэ той: за раён біцца ездзіць, на зборы, на ўліку ў дзіцячым пакоі міліцыі стаіць.

— Ну што, — кажа ён. — Мяне адмыслова да цябе пасадзілі, каб ты мне дапамагаў, Шубрык. Так што давай, дзяліся.

Я гляджу на яго: валасы засаленыя, нямытыя, перхаць блішчыць, твар увесь у шнарах ад драпін. Гнусны выблядак.

Я даю яму спісаць дамашнюю па алгебры, а сам гляджу ў падручнік, тыпу паўтараю. Ён не разбірае майго почырку і кожную хвіліну перапытвае: а гэта што за лічба, Шубрык, га?

Швабра збірае сшыткі, ён яшчэ не ўсё дапісаў. Але я перад носам у Швабры зграбаю сшытак і даю ёй. Ён незадаволена глядзіць на мяне і таксама пхае ёй свой сшытак.

На наступны дзень Швабра раздае сшыткі. Мне пяць, яму – кол і прыпіска: “Калі ўжо спісваць, то хаця б цалкам”.

— Адкуль яна ведае? — псіхуе Быра.

— Ты ж перад носам у яе пісаў.

— Яна сляпая, ніхранаські не бачыць.

— Ну ўбачыла ж.

— Гэта ўсё ты.

Ён дае мне пад партай кулаком у жывот — не надта, але балюча.

— Ты што?

— Нічога.

На наступным уроку, геаграфіі, ніякіх дамашак няма. Настаўнік — поўны дэбіл. Не ведаю, дзе яго знайшлі, у якім псіхдыспансеры, калі Іванавіч

пад чаркай трапіў пад машыну, і яму адарвала нагу. Новы настаўнік усё сядзіць за сталом, глядзіць у акно і расказвае нам пра тое, як служыў у войску ў гэ-дэ-эр і як там было добра. Ніхто яго не слухае, кожны робіць што хоча.

Мы з Бырам — на апошняй парце, і нам усё роўна ніфіга не чуваць, што ён кажа: усе балбочуць міжсобку або гуляюць на паперы ў футбол ці марскі бой.

— Ты не крыўдуй, што я табе ёбнуў на алгебры. Але ты, напэўна, мне нешта не тое спісаць даў.

— Не, усё тое.

— А чаму тады кол?

— Яна бачыла, што ты спісаў.

— Нічога яна не бачыла, яна сляпая.

Нейкі час мы сядзім моўчкі.

— У футбол будзеш? — пытаецца Быра.

— Не, не хачу.

Мы ўчора ўжо гулялі, і ён увесь час махляваў — няправільна адлічваў клетачкі для сябе, больш, чым трэба, а калі я казаў, што няправільна, ён удаваў, што не чуе. Ненавіджу, калі махлююць.

— Калі будзеш мне дапамагаць, спісваць даваць, будзеш мой дружбан, — кажа Быра. — Ты можаш быць нармальным пацаном, а што выдатнік — гэта ўсё херня. Будзем з табой бухаць, і я цябе з блядзямі пазнаёмлю. Школа — ацтой, і настаўнікі ўсе — казлы. Галоўнае — будзь сваім пацаном, і ўсё будзе нармуль.

Дома мама кажа:

— Ты ставішся да яго прадузята. Можа, ён добры хлопчык, хоць і хуліган. Ты ж яго не ведаеш зусім. Ён рос без бацькі, у цяжкай сям’і. Паспрабуй зблізіцца з ім, знайсці пункты судакранання. Можаш дадому яго запрасіць.

З Бырам у нас адна пункт судакранання — секс. Ён ведае пра гэта значна больш за мяне і кажа, што ў яго ўжо было.

— Шмат разоў, з шостага класа. А ты яшчэ ні разу, я ведаю. Але ў класе ўсе пацаны яшчэ хлопчыкі, акрамя мянеі Кузняцова. Так што не сцы.

— Няма ярухі, якая не дае, ё пацан, які не ўмее папрасіць, — тлумачыць мне Быра на русмове.

— А калі цэлка?

— А што цэлка? Што, яна ўсё жыццё цэлка будзе? Раней-пазней — усё роўна. Яна табе сёння скажа — я не буду, таму што цэлка, а заўтра іншы добра папросіць, і ўсё — яна больш не цэлка.

Быра рагоча.

— А ты калі-небудзь цэлку... гэта самае?

— Угу.

— І як?

— Звычайна, толькі мора крыві.

— А колькі ёй гадоў было?

— Пятнаццаць. Або чатырнаццаць. Не памятаю.

— Усяго вось?

— А хулі ты думаў? Думаеш, у нас у класе ўсе яшчэ цэлкі?

— Адкуль я ведаю?

— А я табе скажу. Калдунова ўжо не цэлка і Хмяльніцкая.

— Адкуль ты ведаеш?

— Пацан адзін сказаў. Ён сам іх...

— Хто?

— Не скажу.

— А ты?

— Што я?

— Ну ты б хацеў Калдунову там ці Хмяльніцкую?

— Ты што, дурны? У сваім класе? А калі прывяжацца потым?

Пішам кантрольную па геаметрыі. Я ўжо зрабіў свой варыянт і зараз рашаю тры заданні з пяці для Быры.

— Мне пяць не трэба ці там чатыры. Усё роўна не паверыць, сука.

На наступны дзень усё як трэба: мне — пяць, Быру — тры.

— Малайчына, Шубрык. Будзеш нармальны пацан — навучу цябе, як яруху раскруціць. Ярух вакол мора. Знаёмішся, хуё-маё — у кіно там, марожка-пірожка, ну, ясны болт. Потым праводзіць дадому, зайсці ў пад'езд — пазацісквацца, пасмактацца. І даведацца, калі нікога няма дома. Лепш,

вядома, калі сама пакліча ў госці, каб не набівацца. Ну, а потым само сабой...

У класе мне ніхто не падабаецца, акрамя Ягоркінай. Яна таксама выдатніца, але мяне не трывае. Я ўжо колькі разоў бачыў, як яна размаўляе з Бырам. Якія ў іх могуць быць агульныя інтарэсы, блін? Перад гісторыяй яна падыходзіць да нашай парты, пытаецца ў Быры:

— Ну што, як наконт гэтага?

— Ніяк. Не атрымаецца.

— Шкада.

— Ну і што, што шкада?

— Ну нічога. Я думала, ты дапаможаш.

— Добра, ідзі, мне трэба яшчэ гісторыю пачытаць.

Яна паварочваецца, і ён, сунуўшы руку ёй пад сукенку, шчыпае за сраку.

— Ай. Ты што, дурны?

Яна чырванее. Ёй сорамна, бо я ўсё бачыў. Я размахваюся і б'ю Быру ў нос. Ён здзіўлена глядзіць на мяне. Астатнія, хто бачыў, таксама. У клас уваходзіць гістарыца. З Быравай ноздры выцякае струменьчык крыві. Ён устае і выходзіць з класа.

— Табе пізда, Шубрык, — шэпча Змей, шасцёрка Быры, і хіхікае. — Усё, лічы сябе камуністам.

Быра вяртаецца хвілін праз пяць. Кроў змытая, але паскудства: пляма пад носам засталася. Ён на мяне не глядзіць. Вырывае са сшытка ліст,

малюе на ім магілу з надпісам “Шубрык, 1971–1987”, суне мне. Няправільна. Я 72 года, а не 71-га. Гэта ён 71-га, бо сядзеў два гады ў першым класе.

Што рабіць? Адпрасіцца з заняткаў, тыпу да ветру, і ўцячы дахаты? Нельга. Усе падумаюць, што сасцаў. Ды і не дапаможа ўсё адно: заўтра зноў ісці ў школу. Вось, блін, укляпаўся.

Ад страху хочацца сраць. Я падымаю руку: можна выйсці? Гісторыца ківае. Усе глядзяць на мяне, апроч Быры. Ён малюе ў сшытку аўтагоншчыкаў. Ён на ўсіх уроках малюе аўтагоншчыкаў або салдацікаў.

У прыбіральні — нікога. Усе ўнітазы ўжо забітыя гаўном, і я абіраю чысцейшы.

Потым доўга мыю рукі халоднай вадой — гарачай няма, — і яны амаль што сінеюць. Вяртаюся ў клас.

— Можна сесці?

Гістарыца ківае. Усе зноў глядзяць на мяне.

Звініць званок. Усе падымаюцца, але гістарыца застаецца сядзець. У яе, відаць, наступны ўрок у гэтым жа кабінеце. Значыцца, не зараз. А калі? Выходжу на калідор. Падбягае Змей.

— Быра чакае цябе за школай, на заднім ганку, дзе дзверы закалочаныя. Калі не прыйдзеш, будзе горш.

Ён хіхікае.

Я кладу партфель на падваконне і спускаюся на першы паверх. Выходжу на вуліцу. З даху

капае, і свеціць сонца. Але холадна: яшчэ ж толькі канец лютага.

За вуглом, акрамя Быры, стаяць чалавек сем пацаноў, Ягоркіна і яшчэ дзве ярухі з нашага класа. Быра здымае пінжак, дае Змею. Падыходзіць да мяне. Б'е ў сківіцу. У галаве нешта падтрасаецца, і я падаю. Ён чакае. Я прыкідваюся, маўляў, устаць не магу. З разбітай губы на кашулю капае кроў.

— Кроў за кроў, — кажа Быра. — Паквіталіся.

Усе сыходзяць. Я падымаюся. Галава спярша круціцца, потым вяртаецца да ладу.

Я забіраю партфель, апранаюся ў гардэробе і іду дадому. Фіг з ёй, з геаметрыяй.

Дома мама пытаецца, што здарылася.

— Пабіўся. За дзяўчыну.

— Малайчына. Правільна. Дзяўчына — адна з нямногіх годных падстаў для бойкі.

На наступны дзень іду ў школу ў найпаскуднейшым настроі. Мне сорамна. Але ў класе ніхто не ўспамінае пра ўчарашняе. З Бырам не саджуся, саджуся за пустую парту.

На перапынку іду да класнай.

— Яўгенія Эдуардаўна, я не хачу сядзець з Быркуновым.

— Чаму?

— Ну, не хачу.

— Ён што, да цябе чэпіцца, замінае вучыцца?

— Ну... не.

— А што тады?

— Ну, не ведаю... Не хачу проста.

— Валодзя, давай паспрабуем яшчэ адзін тыдзень. Калектыў — вялікая моц, я шчыра ў гэта веру. Ужо ёсць станоўчыя вынікі. Па апошняй кантрольнай па геаметрыі яму тры, а да гэтага ўвесь час былі двойкі.

Я паварочваюся і сыходжу.

На геаметрыі зноў саджуся адзін. Падыходзіць Быра.

— Слухай, Шубрык, сядай да мяне. Гэта ж тваё месца.

— Не хачу.

— Ну што ты як не пацан? Ты што, са сваім пацаном палаяцца хочаш праз нейкую сучку? Я, вядома, ёбнуў табе, але ты ж сам першы. У мяне з ёй свае справы, наконт пацана аднаго. А ты навошта лез? Я думаў, ты свой пацан, думаў — ты дружбан будзеш, а ты...

— Ладна.

Я перасаджваюся.

На алгебры — самастойная праца, і я рашаю за сябе і за Быру.

— Малайчына, — кажа ён. — Свой пацан. Знайду табе яруху, з якой лёгка дабазарыцца. Будзеш ужо не “хлопчык”, не тое што ўсе гэтыя драчылы. А ты ўвогуле драчыць спрабаваў?

— Не.

— Не веру. Усе пацаны спрабавалі. Нават я, пакуль не пачаў з ярухамі.

Прыходжу дадому — мамы няма. Саджуся ў крэсла, расшпільваю штаны і драчу, уяўляючы сабе Ягоркіну.

Па самастойнай мне чатыры, Быру — тры. Я зрабіў у сябе адну памылку. Лепш бы ў яго. Ці не?

Ягоркіна падыходзіць да Быры і дае яму запіску.

Быра чытае, яна чакае.

— Сёння ў сем гадзін, — кажа ён.

Ягоркіна ўсміхаецца і сыходзіць. Я нічога не пытаю.

На гэтым тыдні наш клас дзяжурыць па школе. Нас з Бырам ставяць у "добрым" калідоры: там ніякіх малых, толькі дзявяты і дзясяты класы. Быра ўвесь час малюе ў сваім сшытку, паклаўшы яго на падваконне. Маляваць ён не ўмее ў прынцыпе, і ўсё выходзіць пачварна і непадобна, але самому яму падабаецца, і я таксама кажу, што шыкоўна атрымалася, калі ён пытаецца.

Падыходзяць два дзесяцікласнікі — Вова-Таракан і Грыша-Туз.

— Слухай, малы, дай дваццаць капеек, — кажа мне Таракан.

— У мяне няма.

— Таракан, не лезь да яго, — Быра адрываецца ад свайго сшытка.

— Ты нешта сказаў? Паўтары.

— Не лезь да яго.

— Гэта што, твой дружбан?

— А можа, і дружбан.

— Слухай, Туз, Быра даўно ўжо нарываецца. Час яму па лычы насуваць. Як ты?

— У прынцыпе, можна. Не, давай лепш не так зробім. Вось, ты кажаш — гэта твой дружбан. Калі ты яму ёбнеш, мы табе даруем. А калі не, то ўдваіх адмяцелім. Ну, як?

Быра бязглузда глядзіць на мяне.

Прусак хапае мяне за пінжак.

— Я гэтага трымаю, каб не здрыснуў.

— Ну шо? — пытаецца Туз у Быры.

Быра ідзе да мяне. Я чакаю, што ён ударыць як быццам моцна, а насамрэч ціхенька, а я прыкінуся, маўляў, моцна. Я так рабіў класе ў пятым, калі ў нас вучыўся Грыб — яго потым у спецшколу забралі. Ён быў найдужэйшы і мог да любых дваіх пацаноў падысці і сказаць: “Вось ты ёбні яго, а то я цябе”. Усе баяліся Грыба, і некаторыя білі па-сапраўднаму, а я — не, каб потым, калі здарыцца наадварот, той, другі, таксама не ўдарыў бы з усяе моцы.

Быра б’е па-сапраўднаму і проста ў “сонейка”. Прусак адпускае мой каўнер. Яны сыходзяць. Быра пхае сшытак у торбу і таксама сыходзіць. Я сяджу на кукішках, потым прысядаю колькі разоў, як казалі пацаны, і іду ў клас. Саджуся адзін.

На наступны дзень — першага сакавіка. Усё шэрае. Растае. Першы ўрок — гісторыя. Да званка

хвілін пяць. Падыходжу да Быры. Ён глядзіць на мяне. Я ўсміхаюся.

— Прывет.

— Прывет.

# ГОПНІКІ

## ЧАСТКА ПЕРШАЯ

Я, Вэк, Бык і Жмут сядзім на лаўцы пад паветкай прыпынку. Шмат разоў перафарбаваная фанерная сценка ў некалькіх месцах праламаная — гэта пацаны паказвалі каратэ. На ёй надрапана “Рабочы — сіла” і “Быра — вырадак”.

Мы палім і плюём пад ногі. Пад лаўкай ужо цэлая лужына бацыл.

Аднекуль выпаўзае Жора. Гэта стары дурны алкаш, ён лазіць па раёне і збірае пляшкі.

— Жора, глядзі — бутэлька, — крычыць яму Вэк.

Пад нашай лаўкай і праўда валяецца бутэлька з-пад піва. Вэк перад гэтым кінуў туды канчарык, а потым пусціў смаркі. Жора нахіляецца, і Вэк нямоцна б’е яго па дупе. Мы рагочам.

Жора абарочваецца.

— Ты фашыст.

— Сам ты фашыст.

— Не, гэта ты фашыст. Ты... ты... ты мяне пакрыўдзіў.

— Лепш валі, пакуль па ябале не дастаў. Шо, адпіздзім Жору? — Вэк глядзіць на нас.

— Давай, — кажу я, хоць мне нехуць, проста абрыдла сядзець. Нудна.

Жора хоча даць дзерака, але бачыць — запозна. Стаіць і чакае, што будзе.

— Можа, не будзем? Ну яго нахер, — кажа Бык.

Вэк не слухае, хапае Жору за куртку і б'е яго ў нос, потым яшчэ. Галава Жоры матляецца, як мяч. З носа цячэ юшка. Некалькі цётак і смаркачоў адыходзяць ад нас як мага далей. Вэк адпускае Жору, і ён валіцца. Мы з Жмутом пачынаем мяцеліць яго нагамі. Жора віскоча, як рэзанае парася.

— Давай абасцым яго, — кажа Вэк.

Я задзіраю куртку і расшпільваю прарэх.

— Глядзі, там бабы, — кажа Жмут.

— Похуй.

Мой струмень ліецца Жору проста на пысу, ён нешта шамкае і чвякае пабітымі вуснамі. Вэк таксама сцыць на яго.

— Што вы творыце, гадаўё? — гарлае нейкая цётка.

— Нічога.

— Я зараз міліцыю паклічу.

— Валяй.

Цётка паварочваецца і ідзе ў бок мянтоўкі — гэта побач.

— Трэба з’ёбваць, — кажа Жмут.

Мы зашпільваем штаны.

— Дарма вы яго, — кажа Бык. — Нахуя прыпыленых чапаць?

*

Наша класуха — Сухая — пакідае мяне пасля заняткаў, каб зрабіць дзірку ў галаве.

— Можаш жа вучыцца, але не хочаш! Ты паразіт на целе савецкай улады, якая семдзесят гадоў цябе корміць і апранае. Аднак для цябе яшчэ не ўсё страчана. Ты яшчэ толькі ў восьмым класе. Зразумей, ты б мог скончыць школу як мае быць, паступіць у інстытут, стаць інжынерам. Навошта табе гэтая хеўра двоечнікаў? Бо па іх даўно турма плача, а ты сын нармальных бацькоў.

Мне астапіздзелі яе гнілыя базары. Іду да дзвярэй.

— Не, я яшчэ не ўсё сказала.

Я абыходжу яе, адчыняю дзверы і бразгаю імі ў Сухой перад носам.

*

Сядзім на прыпынку.

— Э, Бык, ябацца хочаш? — пытаецца Вэк.

— Ад’ябіся.

— Не, скажы, хочаш ці не?

— Зараз ёбну.

— Чаго сцыш?

— Не хачу.

— Што, срака баліць, а?

Мы ўсе рагочам. Бык нямоцна б’е Вэка ў “сонейка”. Яны пачынаюць махацца, але па гульні, не па-сапраўднаму.

Потым Вэк пытаецца ў мяне:

— А ты хочаш ябацца?

— Хачу.

— Ну, ідзі тады дупу памый.

Цяпер ужо яны з Быком рагочуць, як гандоны.

— А ты хочаш, Вэк? — пытаю я.

— Ябаць хачу, ябацца не хачу. Ясна?

Прыбягаюць чацвёра малалетак — гадоў па дванаццаць. У іх разборкі міжсобку. Тры пачынаюць мяцеліць чацвёртага. Ён падае і ляжыць, а яго ўжо мяцеляць нагамі.

Вэк падыходзіць да іх:

— Э-э-э, што такое?! — ён кажа, нібы які сраны настаўнік ці мент. Пацанва спыняецца.

— Запрадаў, — кажа адзін.

— А-а-а. Тады слаба б’яце! — Вэк дае яму нагой у жывот, і пацан пачынае раўці на ўсю вуліцу, як быццам яму адрываюць яйцы. — Добра, піздзіце далей, толькі глядзіце — тут мянтоўка блізка, дружыннікі ўсякія ходзяць.

*

— Хутэн морхэн, — гарлае Тамарачка, вучылка нямецкай. Усе ўстаюць за партамі.

— Зэтц ойсь. Айнэ мінутэ ўсе відэрхольт.

Тамарачка — тоўстая і смярдзючая, як быццам толькі што абасралася. Яна ўсіх у школе заябала сваёй Нямеччынай, але ўсе настаўнікі і нават завучыха ў курсе, што яна дурная, і баяцца з ёй лаяцца.

Я ненавіджу і нямецкую і Тамарачку і ніколі нічога не вучу. Яна ставіць мне “тры”, бо ў класе ёсць нулявыя ўшчэнт, яшчэ горшыя за мяне — Бык і Жмут.

— Ну, што вы, абэлтухі, тундра, думкопфы — як гуляць, дык адразу, а як працаваць, нямецкую вывучыць, дык ніхт ферштэйн? Настаўлю дваякоў за чвэрць, будзеце потым лётаць скардзіцца — дрэнная Тамара Іванаўна. А Тамара Іванаўна не дрэнная, Тамара Іванаўна добрая, яна вас, дэбілаў, на навуку настаўляе.

Пакуль усе гартаюць сшыткі, я знарок гляджу ў акно. Тамарачка заўважае.

— Ганцоў, ком цу ды тафэль з дамашняй работай.

Я бяру сшытак і іду да яе стала.

— Дзе дамашняя работа?

— Няма.

— Пераказвай тэкст.

— Не вывучыў.

— Зэйдысь, цвай.

*

Мама соваецца па пакоі. Я сяджу за сталом, упе-рыўшыся ў акно.

— Ну, што гэта за кара такая? Зноў на працу тэлефанавала Вера Аляксееўна. Казала, што па нямецкай цвайка...

— Тамарачка — прыпыленая. Ты сама ведаеш.

— Не смей так казаць аб настаўніцы! Я працую ад рана да рана за капейкі: пяцьдзясят палучкі, пяцьдзясят авансу, — а вы гэтага не шануеце, што ты, што ён.

— Тата таксама працуе.

— Цудоўна. А дзе тады грошы?

— Не ведаю.

— Вы з ім мяне ў магілу хутка загоніце. Што гэта за жытка такая?

Я маўчу. Яна выходзіць з пакоя.

*

Фізіца захварэла, і ўрока няма.

— Хадзем пагуляем, — кажа Вэк. — Усе пацаны, хадзем. Хулі мы тут сіднем сядзім?

Ідзем я, Бык, Быра, Жмут, Кашчэй і Куня. Выдатнік Ягораў і рэшта "ўзорнапаводзінных" застаюцца ў класе з бабамі.

На бакавым ганку Вэк дастае пачак “Сталічных” і дае ўсім цыгарэціны, нават Куню. Мы палім.

— Ну што, давайце ў жмуркі пагуляем? — пытаецца Вэк.

— Ты што, ахуеў, мы што — смаркаты першы клас, бля? — кажа Жмут. Вэк падміргвае яму, і Жмут скеміў. — Але... Ат, добра, давай.

— Куня, ты вода, — кажа Вэк. — Давай сюды свой піянерскі хамуцік. Зараз вочы табе завяжам. Карацей, за школу не забягаць, толькі да плота і турнікоў.

Ён здымае з Куні гальштук — з абгрызенымі рагамі, закаляканы асадкай — і завязвае яму вочы.

— Ну, давай, вадзі.

Усе разбягаюцца, акрамя Вэка і Жмута. Я зразумеў, што яны задумалі. Побач з ганкам — вялікая, яшчэ не высахлая купа гаўна. Пакуль Куня гойсае туд-сюд, выставіўшы рукі перад сабой, Вэк бярэ з зямлі палку і пачынае калупаць гаўно. Начапіць яго на палку не выходзіць. На зямлі валяецца нечы сшытак у зялёнай вокладцы, і Вэк бярэ яго, падсоўвае пад гаўно, падымае. Ён ідзе да Куні.

Куня хапае яго, крычыць:

— Ёсць!

Вэк мажа яму серывам рукі і рот. Усё рагочуць, Куня зрывае гальштук, плюецца і плача, размазвае па твары слёзы, смаркі і гаўно.

— Ты цяпер гаўном памазаны, — кажа Жмут. — Самы апошні.

— Ён і так самы апошні, а цяпер дык ушчэнт, — Вэк усміхаецца.

Куня ўцякае. Мы садзімся на ганак пакурыць. Вэк нюхае свае пальцы.

— Бля, гаўном смярдзяць. Я ж паперкай браў...

— Ну, гаўно на тое і гаўно, — кажу я. — Не чапай — смярдзець не будзе, а раз дакрануўся, будзеш цяпер хадзіць смердзюком.

— Ладна, не піздзі.

*

Мы з Вэкам сядзім на турніках на школьным двары. Ужо вечар. Свецяцца вокны спартзалы: там нейкі клас гуляе на фізкультуры ў валейбол.

Вэк пытаецца:

— Ведаеш, якія ярухі ў класе ўжо ябаліся?

— Ну, Лазарэнка, можа быць...

— Не, гэтая яшчэ трымаецца. А вось Анохіна і Хмяльніцкая — гэтыя ябаліся.

— Адкуль ведаеш?

— Старыя пацаны распавядалі. Хмяльніцкая хадзіла з пацанамі з "Піянераў". Яны летам пайшлі ў паход, ярухі і хлопцы, і ён там ёй засадзіў. А Анохіну хорам адпярдолілі. У вёсцы. Яна там у бабкі сваёй была летам, і там пацаны — гадоў

па сямнаццаць, мясцовыя. Яны бухалі, потым бачаць — Анохіна на ровары рассякае. Схапілі яе — і ў лазню. Але ў іх там нешта не атрымалася, хацелі адпусціць, а там прыйшоў яшчэ пацан здаровы, аснова мясцовая, і разам яны яе працягнулі.

— А яна што?

— Заяву накатала. Селі пацаны. Суда яшчэ не было, у кастрычніку мусіць быць. А ёй хулі — пакуль была цэлка, такая выдатніца тыпу, а цяпер ябецца з кім схоча.

— Піздзіш.

— Зуб даю. Мне ведаеш хто казаў? Гурон, ён сябар Макакі. Яны да яе на Гаўнацечку падвалілі, але не піздзілі, нічога такога, усё па-добраму. Дамовіліся — і наперад. Нават Быра да яе і тое пад'язджаў, але яна яму не дасць: ён такі вырадак.

— А ты сам — не хочаш да яе?

— Не-а. У сваім класе нельга ні з кім звязвацца. Прывяжацца — хуй потым адстане. Як на тое, усе бабы — блядзі і прастытуткі. Усе хочуць ябацца. Нават Карпекіна. Проста баяцца яшчэ. А пасля школы ябуцца на ўсе застаўкі. Асабліва студэнткі...

— Так, кажуць, студэнткі — самыя злыябучыя. Вось бы зняць адну...

— Хрэн у вочы, — кажа Вэк. — Яны з прафесарамі ды з дацэнтамі. Ты ім нахер похер.

— А тыпу ты ім не похер?

*

Нас прымаюць у камсамольцы. Усіх даўно ўжо прынялі, засталіся толькі я, Бык, Быра, Куня, Вэк і Жмут — найгоршыя па вучобе або па паводзінах. Першых прынялі яшчэ ў сёмым, на 23 лютага, астатніх — на дзень нараджэння Лысага, на Першага мая і на Дзявятага мая.

Мы ўпяцёх і яшчэ трое пацаноў з "А" класа — мы клічам іх "алкашы" — сядзім у калідоры пад дзвярыма піянерскага пакоя. Нам раздалі пацёртыя кніжачкі — статут ВЛКСМ — і сказалі вывучыць ад дошчачкі да дошчачкі пра "дэмакратычны цэнтралізм".

Першы ідзе Вэк, хвіліны праз тры выходзіць.

— Ну што?

— Заябісце. Прынялі.

— "Дэмакратычны цэнтралізм" пыталі?

— Пыталі.

— І ты распавёў?

— Ага.

Усе заходзяць па чарзе, і ўсіх прымаюць.

За сталом — мудак Невядомскі з дзясятага "Б", сакратар камітэта камсамола школы, старэйшая піянерважатая — прастытутка Эла і дзве дзесяцікласніцы з камітэта камсамола. Невядомскі іх, мусіць, ябе аж за вушамі трашчыць.

— Раскажы дэмакратычны цэнтралізм, — кажа

адна і ўсміхаецца, потым глядзіць у акно — як быццам усё яе заябала.

— Дэмакратычны цэнтралізм — гэта...

— Добра, — кажа Невядомскі. — Галоўнае, каб да райкаму вывучыў. Праз тыдзень паедзеце. Усё, ідзі.

*

Едзем у райкам камсамола. Пасля другога ўрока нас адпусцілі дадому, каб пераапрануліся ў парадную форму — начапілі белыя кашулі. Піянерскіх гальштукаў мы даўно не носім, замест іх — звычайныя. Толькі Куня цягае свой хамуцік.

Да цэнтра даязджаем на тралейбусе. Да райкама яшчэ ё час, і мы гуляем па горадзе. У кіёску ля ГУМа працуе мужык з адвіслай губой, па ёй цякуць сліны. Усе ведаюць, што ён — дэбіл.

— Не прадасць ён табе цыгарэтаў, — кажа Жмут.

— Убачыш. Гэты ўсім прадае. Яму ўсё да сракі — ён прыпылены, — рагоча Вэк.

У шапіку толькі “Астра” і “Прыма”.

— Пачак “Астры”, — Вэк суне ў дзірку жменю жоўтай дробязі.

Прадавец паволі лічыць капейчыны, выцягвае аднекуль пачак і дае Вэку.

— А ў вас “Сталічныя” бываюць? — пытаю я.

— Бываюць, калі цябе ярухі ябаюць, — мужык рагоча. Мы таксама.

— А “Космас”?

— Прывядзі мне бабу з доўгім хуём, тады будзе табе “Космас”.

Мы ўсё рагочам, і мужык таксама. У яго задаволеная пыса.

Па калідорах райкама бегаюць дзядзькі і цёткі, а на кожным паверсе — партрэт Лысага ў падрапанай рамцы.

Пад дзвярыма ўжо сядзяць абодва “алкашы”.

— Ну, што? — пытаецца іх Вэк.

— Нічога.

З кабінета выходзіць цётка:

— Вы з сямнаццатай? Заходзьце па адным.

Я іду другі, пасля Андрона з “А” класа. За сталом, акрамя той цёткі, яшчэ адна.

Я кажу:

— Дабрыдзень.

— Дабрыдзень. Як прозвішча?

— Ганцоў.

— Дэмакратычны цэнтралізм вучыў?

— Вучыў.

Цёткі глядзяць адна на адну і смяюцца. Ім да сракі і цэнтралізм, і ўсё астатняе. Думаюць, відаць, толькі пра тое, каб пабухаць і паблядаваць.

— Школа — адна з найгоршых у раёне, а дрэсіраваць умеюць, — кажа другая цётка.